2. *Суворова, В. А.* Миграционный кризис в Европе: проблемы вынужденной миграции / В. А. Суворова // Власть. – 2018. – № 1. – С. 176–179.
3. *Медушевский Н. А.* Миграционный кризис в Европе сквозь призму статистических данных / Н. А. Медушевский // Власть. – 2017. – № 11. – С. 169–172.
4. *Малахов, В. С.* Германия после «миграционного кризиса»: политика, экономика, общество / В. С. Малахов // Мировая экономика и международные отношения. – 2018. – Т. 62. – № 5. – С. 41–51.
5. *Васильев, В. И.* Европейская политика Австрии и Германии: между прагматизмом и правым популизмом / В. И. Васильев // Мировая экономика и международные отношения. – 2018. – Т. 62. – № 8. – С. 54–64.
6. *Бадаева, А. С.* Ультраправые в Западной Европе: на пределе возможностей / А. С. Бадаева // Мировая экономика и международные отношения. – 2018. – Т. 62. – № 2. – С. 37–46.
7. Парламентские выборы в Эстонии выиграла Партия реформ [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.belta.by/world/view/parlamentskie-vybory-v-estonii-vyigrala-partija-reform-338788-2019. – Дата доступа : 06.03.2019.

*Поступила в редакцию 14.03.2019*

**А. М. Кушнярэвіч**

# АБ РОЛІ ГЕРМАНСКІХ УПЛЫВАЎ НА ЕЎРАПЕІЗАЦЫЮ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У XIV–XVIII ст.: СУЧАСНЫ ПОГЛЯД У АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ І КУЛЬТУРАЛОГІІ

В статье характеризуется история исследования немецких влияний на правовую и конфессиональную культуру белорусских земель XIV–XVIII вв. в отечественной гуманитарной науке XX – начала XXI в. Отмечается, что данная тема характеризуется недостаточной ее разработанностью в отечественной историографии с точки зрения концептуальных обобщений и конкретных выводов по основным аспектам роли германских влияний на степень интеграции белорусской культуры рассматриваемого времени в европейскую цивилизацию. Предшествующие работы, по мнению автора, подготовили основу для обобщающе-культурологического исследования данной проблемы.

Актуальнасць вывучэння германа-беларускіх культурных стасункаў дадзенага часу абумоўлена тым, што на сучасным этапе развіцця міжнародных адносін Германія пераўтварылася ў адну з вядучых еўрапейскіх краін, якая дынамічна развіваецца і рознабаковыя ўплывы якой у свеце пастаянна ўзрастаюць, таму развіццё двухбаковых кантактаў з гэтай краінай у розных сферах дзейнасці мае для Беларусі вялікае значэнне. Асновай жа для паўнавартаснага ўзаемнага культурнага супрацоўніцтва з'яўляюцца, з аднаго боку, унікальнасць і самабытнасць культурных традыцый абедзвюх краін, а з другога – назапашаны ў папярэднія часы прадуктыўны вопыт культурных кантактаў, які можа стаць прадметам навуковых даследаванняў і асновай далейшых плённых германа-беларускіх міжкультурных сувязяў.

Заходнееўрапейскім жа ўплывам на культуру Беларусі садзейнічала яе геапалітычнае становішча паміж усходняй візантыйскай і еўрапейскай цывілізацыямі, у кантактнай зоне культурна-рэлігійных арэалаў праваслаўя і каталіцтва. Гэта выпрацавала спецыфічны менталітэт беларускага народа па ўспрыманні не толькі ўсходняй, але і заходне-еўрапейскай культуры і цывілізацыі, а таксама абумовіла шырокія кантакты з Захадам, у прыватнасці з Германіяй, сувязі з якой садзейнічалі працэсу еўрапеізацыі беларускай культуры.

Адным з сведчанняў гэтаму з'яўляецца распаўсюджванне магдэбургскага права – сістэмы нямецкага гарадскога самакіравання, якоеназіралася ў Еўропе ў XIII–XVIII ст. У айчыннай гістарыяграфіі XX ст. адным з першых да гэтага пытання звярнуўся В. Д. Дружчыц, які даследаваў формы і функцыі войтаўскай улады і магістратаў у беларускіх гарадах з гэтым правам [1], а таксама арганізацыю і функцыяніраванне магістратаў беларускіх гарадоў на прыкладзе Вільні, Бярэсця, Полацка, Мінска, Магілёва, Віцебска [2].

Грунтоўны артыкул дзеянню магдэбургскага права ў гарадах Беларусі прысвяціў З. Ю. Капыскі, у якім ахарактарызаваў саслоўны склад іх магістратаў [3]. Даследчык А. П. Грыцкевіч адзначыў важную ролю магдэбургскага права ў эканамічным і сацыяльна-палітычным развіцці беларускіх гарадоў [4, с. 63] .

У. І. Пічэга ў фундаментальным выданні «Гісторыя беларускага народа» вылучыў на першае месца эканамічны фактар у наданні магдэбургскага права гарадам і мястэчкам Беларусі [5, с. 107].

У артыкуле «Самакіраванне гарадоў Беларусі па Магдэбурскаму праву ў другой палове XVII–XVIII ст.» А. М. Карпачаў ахарактарызаваў яго ролю ў развіцці саслоўных правоў мяшчан [6].

В. І. Мялешка на прыкладзе Магілёва звярнуў увагу даследчыкаў на тое, што магдэбургскае права «не было механічным перанясеннем нямецкага права ў яго чыстым выглядзе на тэрыторыю Беларусі, яе гарады мелі свае асаблівасці, якія ўплывалі на змены яго асобных палажэнняў» [7, с. 176–177].

На думку вядомага гісторыка права І. А. Юхо, запазычванні з нямецкага права па адміністрацыйных і крымінальна-працэсуальных пытаннях былі прыстасаваны да агульнадзяржаўнага заканадаўства [8, с. 82].

Удасканальванне сістэмы органаў дзяржаўнай улады і кіравання пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь выклікала неабходнасць далейшых грунтоўных даследаванняў гісторыі дзяржавы і яе асноўных інстытутаў. Беларускія навукоўцы працягвалі даследаванне гісторыі гарадоў і іх самакіравання, якое было распачата яшчэ дарэвалюцыйнымі гісторыкамі.

У 90-я гады XX – пачатку XXI ст. быў выдадзены шэраг абагульняючых даследаванняў па гісторыі Беларусі, у якіх асвятляліся і пытанні гарадскога самакіравання. Асобныя яго аспекты разглядаліся ў навуковых артыкулах, выступленнях на навуковых канферэнцыях, прысвечаных развіццю гарадоў з нагоды гадавін надання ім магдэбургскага права [9, с. 64–72].

Так, А. Б. Доўнар прывёў агульную характарыстыку магдэбургскага права ў фундаментальным энцыклапедычным выданні «Вялікае Княства Літоўскае» (далей ВКЛ), у якім ён, у прыватнасці, адзначае, што «магдэбургскае права афармляла горад як самастойную адміністрацыйную адзінку са сваімі атрыбутамі – тэрыторыяй, грамадзянствам, інстытутамі ўлады і суда, гербам, падатковай сістэмай і г.д.» [10, с. 241].

Навуковец П. А. Лойка, разглядаючы пытанні гарадскога самакіравання ў артыкуле, прысвечаным унутранай палітыцы ВКЛ у XIV–XV ст., адзначае, што адпаведна граматам на магдэбургскае права ў гарадах у той час былі вызначаны асноўныя прынцыпы самакіравання [11, с. 183].

В. Ф. Голубеў, асвятляючы працэс фарміравання агульнадзяржаўнага рынку і мяшчанскага саслоў'я, звяртае ўвагу на той факт, што беларускія гарады, дабіўшыся магдэбургскага права, пры гэтым набывалі не толькі судова-адміністрацыйную, але і фінансава-гаспадарчую самастойнасць [12, с. 376–378].

Па меркаванні Ю. М. Бохана, магдэбургскае права «не насіла ў беларускіх гарадах усеабдымны характар, бо не только не ўсе гарады яго мелі, але і ў саміх прывілегіяваных гарадах частка насельніцтва яму не падлягала» [13, с. 360].

У манаграфіі А. К. Цітова «Вольныя беларускія месты» [14] разгледжаны гістарычныя аспекты існавання самакіравання ў вялікакняжацкіх беларускіх гарадах, арганізацыя іх жыцця на прынцыпах магдэбургскага права.

Шматлікія аспекты ўжывання сярэднявечнага нямецкага права на землях, размешчаных на усход ад Германіі, аналізуюцца ў працах В. Б. Келер [15–18]. Даследчыца істотна пашырыла поле навуковых даследаванняў у галіне германістыкі, якія дазваляюць рэканструяваць невядомыя аспекты ў цывілізацыйным узаемадзеянні паміж германскім і славянскім культурным светам.

Значную навуковую цікавасць таксама ўяўляюць манаграфіі М. Д. Макарава [19] і С. П. Стрэнкоўскага [20], прысвечаныя нямецкаму праву на беларускіх землях. Пры гэтым М. Д. Макараў даследаваў сістэмы самакіравання, што сфарміраваліся ў гарадах Падзвіння пасля надання ім магдэбургскага права, а таксама тыя, што грунтаваліся на мясцовым праве.

С. П. Стрэнкоўскі разгледзеў шырокі спектр пытанняў развіцця гарадскога самакіравання з нямецкім правам на беларускіх землях. У выніку даследчык устанавіў, што ў XV–XVIII ст. побач з магдэбургскай сістэмай існавалі і мясцовыя формы самакіравання [20, с. 236].

Сістэмна і комплексна даследаваць працэс распаўсюджвання нямецкага сярэднявечнага права на Беларусі дапамагае і публікацыя Н. В. Місарэвіча «Магдэбургскае права ў гісторыі беларускай дзяржаўнасці», у якой навуковец прыйшоў да высновы, што нормы гэтага права «не толькі стымулявалі далейшае распаўсюджванне ідэі самакіравання ў беларускіх гарадах, але і аказвалі уплыў на развіццё і удасканаленне агульна-дзяржаўнага судовага заканадаўства ВКЛ» [21].

Акрамя нямецкага права другім важным фенаменам уплыву Германіі на беларускія землі была Рэфармацыя, якая мела шматгранныя сувязі з культурным і палітычным развіццём краіны у складзе ВКЛ. Грамадска-палітычныя і філасофскія аспекты дадзенай праблемы доўга вывучаў С. А. Падокшын, які ў манаграфіі «Рэфармацыйная і грамадская думка Беларусі і Літвы (другая палова XVI – пачатак XVII ст.)» прыйшоў да высновы, што «беларускі і літоўскі рэфармацыйны і гуманістычны рух не быў адгалоскам Заходняй Рэфармацыі і гуманізму, а выступаў як нацыянальная гістарычная і культурная з'ява, а ідэолагі Рэфармацыі і гуманізму Беларусі і Літвы былі не эпігонамі еўрапейскіх рэфармацыйных дзеячаў і гуманістаў, а самастойнымі мысліцелямі» [22, с. 205].

Для вывучэння нямецкіх уплываў на культуру Беларусі важным з'яўляецца і другое даследаванне С. А. Падокшына «Роздум над Рэфармацыяй у Вялікім Княстве Літоўскім», з якога вынікае, што дзякуючы «…Адраджэнню і Рэфармацыі ў шматканфесійнай і шматэтнічнай беларуска-літоўскай дзяржаве паўстала рэнесансава-гуманістычная, або ліберальная мадэль грамадскага і духоўнага жыцця, падставай для якой з'ўляліся прынцыпы рэлігійнай талерантнасці (Варшаўская канферэнцыя 1573 г.), вяршэнства закона (Статут 1588 г.), духоўна-культурнага плюралізму, цярпімасці і павагі да іншага (дзённік Фёдара Еўлашоўскага, рознаканфесійныя школы, друкарні, кнігі, антычная літаратура» [23, с. 26]. Духоўна-філасофскія дасягненні рэфармацыйнага руху на Беларусі ахарактарызаваны даследчыкам у 3-м томе «Гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі» [24, с. 134–142].

Гістарычныя аспекты распаўсюджвання Рэфармацыі ў беларускай культуры распрацоўвае Л. С. Іванова, якая лічыць, што Рэфармацыя на тэрыторыі Беларусі развівалася ў рэчышчы еўрапейскага рэфармацыйнага руху і ўспрыняла знешнія формы заходне-еўрапейскага пратэстантызму, яго асноўныя накірункі, дагматы, формы царкоўнай арганізацыі, але мела своеасаблівыя рысы [25; 26].

Сярод навуковых артыкулаў неабходна згадаць змястоўную характарыстыку Рэфармацыі ў Еўропе, якую прывёў А. П. Грыцкевіч у зборніку матэрыялаў навукова-практычнай канферэнцыі «Рэфармацыя і залаты век Беларусі», арганізаванай у 2001 г. згуртаваннем беларусаў свету «Бацькаўшчына». На яго думку, гэты рэлігійны феномен стаў папярэднікам эпохі асветніцтва і новага грамадска-палітычнага ладу, што ўсталяваўся ў канцы XVIII–XIX ст. [27, с. 9].

У сваей публікацыі С. Акінчыц засяродзіў сваю ўвагу на тым, што Рэфармацыя змяніла эканоміку, палітычнае аблічча Еўропы і сфарміравала заходнюю цывілізацыю [28, с. 20]. «На фоне ўсяго, што адбывалася ў Еўропе, цяжка не заўважыць, як адзначае даследчык, сувязі паміж распаўсюджваннем ідэй Рэфармацыі і развіццём беларускага грамадства, бо Біблія Скарыны і развіццё школьніцтва і кнігадрукавання, і зямельная, судовая, адміністрацыйныя рэформы XVI ст., і Статуты ВКЛ, рост гарадоў, уздым культуры і эканомікі маюць сваёй прычынай нішто іншае, як ідэі Рэфармацыі» [28, с. 21–22].

У артыкуле «Залаты век Беларусі: Рэфармацыя і мова» Л. Лыч сцвярджае, што «невядомая дагэтуль павага царквы да мясцовых моў з'явілася адной з асноўных прычын таго, што прагрэсіўныя ідэі Рэфармацыі атрымалі шырокае распаўсюджванне ў краінах Еўропы, што спачатку многія каталіцкія, а затым і праваслаўныя храмы сталі ператварацца ў пратэстанцкія» [29, с. 29].

Т. Доўнар дапоўніла матэрыялы гэтай канферэнцыі звесткамі аб уплывах Рэфармацыі на беларускую культуру ў сферы палітыка-прававой думкі на прыкладзе Статута ВКЛ 1566 г. [30].

Уяўленне аб формах германа-беларускіх кантактаў часоў Рэчы Паспалітай пашырыў артыкул А. Самусіка, прысвечаны сувязям беларускіх зямель з краінамі Захаду і Цэнтральнай Еўропы ў XVIII ст., у тым ліку і з Германіяй, у сферы адукацыі [31].

Але ўсё ж патрэбна адзначыць, што у айчыннай гістарыяграфіі і гістарычнай культуралогіі адсутнічаюць абагульняючыя даследаванні, прысвечаныя нямецкім уплывам на духоўную культуру Беларусі, што ў многім тлумачыцца складанасцю вывучэння поліэтнічных і мульцікультурных дзяржаў гэтага часу, якімі былі Вялікае Княства Літоўскае і Германская імперыя. У галіне духоўнай культуры гэтыя ўплывы вывучаліся беларускімі гісторыкамі і філосафамі пераважна на прыкладзе распаўсюджвання нямецкага сярэднявечнага права і Рэфармацыі на беларускіх землях у XIV–XVIII ст. Каштоўныя працы беларускіх навукоўцаў па гісторыі сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных працэсаў паступова падрыхтавалі глебу для абагульняльна-тэарэтычнага даследавання германа-беларускіх культурных сувязяў у іх гістарычнай дынаміцы.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Дружчыц, В. Д.* Войты і іх улада ў беларускіх месцах з магдэбургскім правам / В. Д. Дружчыц. – Мінск : Інбелкульт, 1928. – 58 с.

2. *Дружчыц, В. Д.* Магістрат у беларускіх месцах з магдэбургскім правам у XV–XVII сталеццях / В. Д. Дружчыц. – Мінск : Друк. Беларус. акад. навук, 1929. – 79 с.

3. *Капыскі, З. Ю.* Магдэбургскае права ў гарадах Беларусі (канец XV – першая палова XVII ст.) / З. Ю. Капыскі // Советское славяноведение. – 1972. – № 5. – С. 26–41.

4. *Грицкевич, А. П.* Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. / А. П. Грицкевич. – Минск : Наука и техника, 1975. – 248 с.

5. *Пичета, В. И.* История белорусского народа / В. И. Пичета. – Минск: БГУЦ, 2003. – 184 с.

6. *Карпачоў, А. М.* Самакіраванне гарадоў Беларусі па магдэбургскаму праву ў другой палове XVII–XVIII ст. / А. М. Карпачоў // Весці Акад. навук Беларускай ССР. Сер. грамадскіх навук. – 1969. – № 2. – С. 56–64.

7. *Мелешко, В. И.* Могилёв в XVI – первой половине XVII в. / В. И. Мелешко. – Минск : Наука и техника, 1988. – 264 с.

8. *Юхо, И. А.* Правовое положение населения Белоруссии в XV в. / И. А. Юхо. – Минск : БГУ, 1978. – 141 с.
9. *Стрэнкоўскі, С. П.* Сучасная айчынная гістарыяграфія гарадскога самакіравання Беларусі ў канцы XIV–XVIII ст. / С. П. Стрэнкоўскі // Весн. Гродзен. дзярж. ун-та імя Я. Купалы. Сер. 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. – 2012. – № 2 (130). – С. 64–72.
10. *Доўнар, А. Б.* Магдэбургскае права / А. Б. Доўнар // Вялікае Княства Літоўскае: энцыкл.: у 2 т. Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2006.
11. *Лойка, П. А.* Унутраная палітыка ВКЛ у XIV–XV ст. / П. А. Лойка // Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва. – Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]. – Мінск : Бел. навука, 2008. – С. 179–186.
12. *Голубеў, В. Ф.* Фарміраванне агульнадзяржаўнага рынку і мяшчанскага саслоў'я ў беларускіх гарадах перыяду ВКЛ / В. Ф. Голубеў // Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва. – Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]. – Мінск : Бел. навука, 2008. – С. 186–197.
13. *Бохан, Ю. М.* Сацыяльнае развіццё беларускіх гарадоў у складзе ВКЛ / Ю. М. Бохан // Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва. – Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]. – Мінск : Бел. навука, 2008. – С. 198–212.
14. *Цітоў, А. К.* Вольныя беларускія месты / А. К. Цітоў. – Мінск : БРФПДР, 1996. – 36 с.
15. *Келлер, О. Б.* Средневековое немецкое право на землях Центральной и Восточной Европы в XIII–XVIII вв. / О. Б. Келлер. – Минск : РИВШ, 2012. – 242 с.
16. *Келлер, О. Б.* Разновидности немецкого средневекового права на белорусских землях Великого Княжества Литовского и Речи Посполитой / О. Б. Келлер // Працы гістарычнага факультэта БДУ. – Мінск, 2014. – Вып. 9. – С.176–186.
17. *Келлер, О. Б.* Применение Магдебургского права на белорусских землях Великого Княжества Литовского и Речи Посполитой / О. Б. Келлер // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: зб. навук. артыкулаў. – Мінск, 2015. – Вып. 10. – С. 118–129.
18. *Келлер, О. Б.* Трансферт средневекового немецкого права на земли к востоку от Германии / О. Б. Келлер. – Минск : РИВШ, 2017. – 392 с.
19. *Макараў, М. Д.* Ад пасада да магдэбургіі: прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XVI – першай палове XVII ст. / М. Д. Макараў. – Мінск : Экаперспектыва, 2008. – 248 с.
20. *Стрэнкоўскі, С. П.* Прывілеі і вольнасці беларускіх гарадоў з нямецкім правам у канцы XIV – канцы XVIII ст. / С. П. Стрэнкоўскі. – Мінск : МГІРА, 2008. – 251 с.

21. *Мисаревич, Н. В.* Магдебургское право в истории белорусской государственности / Н. В. Мисаревич // Весн. Гродзен. дзярж. ун-та імя Я. Купалы. Сер. 4. Правазнаўства. – 2013. – № 3 (155). – С. 29–35.
22. *Падокшын, С. А.* Реформационная и общественная мысль Белоруссии и Литвы (вторая половина XVI – начало XVII в.) / С. А. Падокшын. – Минск : Наука и техника, 1970. – 224 с.
23. *Падокшын, С. А.* Роздум над Рэфармацыяй у Вялікім Княстве Літоўскім / С. А. Падокшын // Рэфармацыя і залаты век Беларусі: матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 1 чэрв. 2002 г. / уклад. С. Акінчыц. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2002. – С. 23–27.
24. *Падокшын, С. А.* Рэфармацыйны рух: духоўна-філасофскія дасягненні і асэнсаванні / С. А. Падокшын // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. Т. 3: Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Барока / аўт. тома: В. Б. Евароўскі [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2013. – С. 96–197.
25. *Іванова, Л. С.* Еўрапейскае аблічча і рэгіянальныя асаблівасці рэфармацыі на Беларусі (другая палова XVI – сярэдзіна XVII ст.) / Л. С. Іванова. – Мінск : ЗАО «Пропилеи», 1998. – 11 с.
26. *Іванова, Л. С.* Рэфармацыя / Л. С. Іванова // Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]. – Мінск : Экаперпектыва, 2008. – С. 504–519.
27. *Грыцкевіч, А.* Рэфармацыя ў Еўропе ў XVI стагоддзі / А. Грыцкевіч // Рэфармацыя і залаты век Беларусі: матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 1 чэрв. 2002 г. / уклад. С. Акінчыц; рэдкал.: А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2002. – С. 3–9.
28. *Акінчыц, С.* Рэфармацыя – аднаўленне першапачатковага вобразу / С. Акінчыц // Рэфармацыя і залаты век Беларусі: матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 1 чэрв. 2002 г. / уклад. С. Акінчыц; рэдкал.: А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2002. – С. 15–22.
29. *Лыч, Л.* Залаты век Беларусі: Рэфармацыя і мова / Л. Лыч // Рэфармацыя і залаты век Беларусі: матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 1 чэрвеня 2002 г. / уклад. С. Акінчыц; рэдкал.: А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2002. – С. 28–34.
30. *Доўнар, Т.* Рэфармацыйны рух на Беларусі і Статут 1566 года / Т. Доўнар // Рэфармацыя і залаты век Беларусі: матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 1 чэрвеня 2002 г. / уклад. С. Акінчыц; рэдкал.: А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2002. – С. 48–58.
31. *Самусік, А.* Навукова-асветныя кантакты беларускіх зямель з краінамі Заходняй і Цэнтральнай Еўропы ў XVIII ст. / А. Самусік // Журнал международного права и международных отношений. – 2007. – № 1 (40). – С. 39–41.

*Поступила в редакцию 14.03.2019*